25. *Киселёв, К. В.* Записки советского дипломата / К. В. Киселёв. – М.: Политиздат, 1974. – 527 с.; 17 л. ил.

26. *Казлова, В. В.* Лынькоў, Міхась / В. В. Казлова // Беларуская Савецкая Энцыклапедыя: [у 12 т.] / Акад. навук БССР, гал. рэд. Беларус. Сав. Энцыкл. – Мінск: Гал. рэд. БелСЭ, 1969–1975. – Т. 6: Кішынёў–Манцэвічы. – 1972. – С. 449–450.

27. *Уоддис, Д.* Африка. Причины взрыва / Д. Уоддис; пер. с англ. – М.: Изд-во иностр. лит-ры, 1962. – 349 с.

28. Petitions from the representatives of the Wa-Meru tribe (T/PET.2/99 and Adds. 1–7) and from Gamaliell Sablak (T/PET.2/143) concerning Tanganyika // UN. Trusteeship Council (11th sess.: 1952). – Adopted at the 452nd plenary meeting, 22 July 1952. – Official Documents. – P. 4–8.

**(Дата падачы: 27.02.2018 г.)**

*Д. А. Безмацерных*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск

*D. A. Bezmatsernykh*
Belarusian State University, Minsk

**УДК 930.2(476.5)«16/18»**

# БРАСЛАЎСКІ ЗЕМСКІ СУД ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XVI–XVIII СТСТ. У ГІСТАРЫЯГРАФІІ ЦЭНТРАЛЬНАЙ І ЎСХОДНЯЙ ЕЎРОПЫ XIX – ПАЧАТКУ XXI СТ.

# BRASLAW ZEMSKY COURT 16-18TH CENTURY IN HISTORIOGRAPHY CENTRAL AND EASTERN EUROPE XIX – EARLY XXI CENTURY

*Артыкул прысвечаны разгляду распрацоўкі праблемы дзейнасці Браслаўскага земскага суда ў другой палове XVI–XVIII ст. у гістарыяграфіі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. На сучасным этапе не было створана ніводнай комплекснай працы, прысвечанай гэтай судовай інстанцыі, аднак яе дзейнасць закранапася ў рамках вывучэння гісторыі як Браслаўскага павета, так і агульнай судовай сістэмы Вялікага Княства Літоўскага. Аналіз гістарыяграфіі дадзеных кірункаў дазваляе вылучыць некалькі этапаў у даследаванні пытання артыкула, а таксама параўнаць гістарыяграфію, створаную на ніве гістарычных і юрыдычных навук.*

*Ключавыя словы: гістарыяграфія Вялікага Княства Літоўскага; Браслаўскі земскі суд; земскі суд; Браслаў; Браслаўскі павет; земская судовая сістэма.*

*This article is devoted to the problems of activity and development Braslaw Zemsky court in the second half of the 16-18th century in the historiography of Central and Eastern Europe. At the present day it was not created any comprehensive work devoted to this court, but its activity was addressed in the study of history as Braslaw Powiat, and the general judicial system of the Grand Duchy of Lithuania. According to the directions of historiography analysis can distinguish several stages in the study of the question of this article, and compare historiography established in the field of historical and legal sciences.*

*Key words: the historiography of the Grand Duchy of Lithuania; the Braslaw zemski court; zemsky court; Braslaw; the Braslawa powiat; zemska court system.*

Браслаўскі павет Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) уваходзіў у Віленскае ваяводства, ахопліваў тэрыторыю, якая ляжала на мяжы Рэчы Паспалітай з Інфлянтскім княствам, таму яго вывучэнне з'яўляецца ключавым у асэнсаванні гісторыі памежжа. Пра палітычнае і сацыяльнае развіццё засталося небагата комплексаў крыніц, менавіта таму даследаванне дзейнасці земскага суда на дадзенай тэрыторыі грае важную ролю.

Тэрытарыяльна-геаграфічнае размяшчэнне Браслаўскага павета абумовіла яго сацыяльны склад і гістарычнае развіццё. Маленькі па памерах, ён быў яшчэ і дастаткова маланаселеным (так, на попіс войска ВКЛ у 1567 г. было выстаўлена 97 почтаў уладароў маёнткаў [1]). Часткова землі яго адносіліся да каралеўскага дамена, складалі надзелы віленскіхураднікаў ці з'яўляліся валоданнямі Віленскай епархіі. Гэта стала не толькі прычынай для нешматлікасці шляхты, якая стала пражывала ці валодала зямлёй у павеце, але і спрыяла імкненню да адміністрацыйнага цэнтру – Вільні. Такое своеасаблівае становішча шляхты мела свой адбітак і ў дзейнасці мясцовага земскага суда.

Трэба ўлічваць, што судовая сістэма як частка палітычнага ладу дзяржавы дае магчымасць глыбейшага аналізу самаго ладу і яго непасрэднага ўплыву на насельніцтва дзяржавы праз паўсядзённую судовую практыку. Земскі суд, які з'яўляўся дастаткова незалежным ад адміністрацыі элементам (яго ўраднікі выбіраліся зямянамі павета з далейшым зацвярджэннем каралём), і яго развіццё з'яўляюцца адлюстраваннем тых правоў, што набыло зямянства дзяржавы ў вызначаны перыяд.

Дзейнасць судовай земскай сістэмы, відавочна закранаючы сацыяльную сферу жыцця тагачаснага грамадства, дазваляе прасачыць не толькі ўзаемаадносіны ўнутры саслоўя шляхты, але і з іншымі саслоўямі (напрыклад, сялянамі, мяшчанамі, слугамі панцырнымі, яўрэямі і інш. [2]). Земскі суд разам з гродскім часам з'яўляўся арбітрам вырашэння мясцовых канфліктаў, а таксама кантраляваў злоўжыванні мясцовай улады. Справы, якія разглядаў земскі суд, і дакументы, якія гэты суд фіксаваў для надання ім юрыдычнай сілы, робяць яго не толькі часткай гісторыі права, але і іншых кірункаў гістарычнага даследавання, такіх як эканамічны, сацыяльны і інш.

Даследаванні па гісторыі Браслаўскага земскага суда другой паловы XVI–XVIII ст. у асноўным адбываліся на ніве двух больш шырокіх сумежных кірункаў. Першы кірунак уключае даследаванні па гісторыі функцыянавання земскай судовай сістэмы на тэрыторыі ВКЛ (гэтая тэма распрацоўвалася ў агульных працах па земскаму суду, ці ў даследаваннях судовай земскай сістэмы іншых паветаў). Другі – па гісторыі рэгіёна ў вызначаны перыяд (у рамках гэтай тэмы закраналіся пытанні, непасрэдна звязаныя з земскім судом (судовыя ўраднікі і г. д.)), а таксама праблемы па гісторыі рэгіёна, якія мелі ўплыў на функцыянаванне земскай сістэмы (склад шляхты і г. д.). І толькі ў апошнія дзесяцігоддзі распачаўся разгляд непасрэдна дзейнасці Браслаўскага земскага суда.

Гісторыя земскай судовай сістэмы на тэрыторыі ВКЛ пачала вывучацца гісторыкамі і юрыстамі ў XIX ст. Першым грунтоўна за вывучэнне судоў у ВКЛ узяўся рускі гісторык Іван Іванавіч Лапа. Сярод шэрагу даследаванняў, прысвечаных розным судам, быў напісаны і артыкул «Земскі суд у Вялікім Княстве Літоўскім на прыканцы XVI ст.», апублікаваны ў 1897 г. [3]. На момант напісання гэтага артыкула ў Актах Віленскай камісіі было выдадзена шэсць тамоў, прысвечаных земскім судам (Брэсцкаму, Віленскаму, Слонімскаму і Гродненскаму), да кожнага з якіх была напісана прадмова, дзе ў кароткай апісальнай форме прапісвалася праца земскага суда. Аднак нельга не адзначыць, што галоўнай задачай публікацыі дадзеных дакументаў і іх выбаркі была дастаткова вузкая мэта: вярнуць і абгрунтаваць пануючы стан праваслаўя на тэрыторыях былога ВКЛ, што дастаткова скажала гістарычную карціну, а вывучэнне саміх земскіх судоў заставалася на памежжы фокуса ўвагі даследчыкаў [4]. Таксама да Лапы тэма судовай сістэмы ВКЛ закранался і ў шэрагу даследаванняў правазнаўцаў, прысвечаных развіццю заканадаўства і права ў ВКЛ. Прыкладам можа служыць праца кіеўскага прафесара права Г. В. Дземчанкі, які разглядаў пакаранні паводле літоўскіх статутаў. Аднак, улічваючы, што, як і ў іншых працах прававедаў, прадметам даследавання быў не земскі суд, дадзеная судовая сістэма закранался там дастаткова ўскосна [5].

Артыкул І. І. Лапы разглядаў заканадаўчыя нормы Бельскага прывілея 1564 г. і статутаў ВКЛ 1566 і 1588 гг., паводле якіх дзейнічаў земскі суд, а таксама выкананне гэтых нормаў на практыцы паводле рукапісных актавых чатырох кніг Віцебскага і адной кнігі Полацкага земскага суда, матэрыялаў Літоўскай метрыкі ды апублікаваных у Актах Віленскай камісіі і Актах Паўднёвай і Заходняй Расіі. Гісторык акрэсліў шырокі спектр пытанняў функцыянавання земскай судовай сістэмы. Пачынаючы ад апісання крыніц, на падставе якіх быў напісаны артыкул, даследчык паказаў месца і ролю, якія адыгрываў земскі суд у тагачасным жыцці не толькі шляхты, але і ўсёй дзяржавы. Ён падкрэсліваў таксама і ролю даследаванняў на падставе вывучэння дадзенага аб’екта – земскага суда. У артыкуле закраналіся ўсе працэдурныя пытанні: элекцыя судовыхураднікаў, іх прысяга, праходжанне судовых сесій ці кадэнцый альбо рочкаў з апісаннем не толькі тэрмінаў, калі адбываліся, але парадку засяданняў, закрыццё гэтых сесій і далейшае захаванне актавых кніг. Разглядаюцца судовыя ўраднікі (суддзя, падсудак і пісар): іх функцыі, магчымыя кандыдаты на іх ролі, іх фінансавы стан, часовая замена. У кола ўвагі даследчыка трапляюць таксама і падпіскі з вознымі разам з іх абавязкамі і прызначэннем. Аналізуюцца і іншыя ўдзельнікі судовага працэса – асобы, якія ўстаюць перад судом (зыскоўцы, адказчыкі, іх прадстаўнікі (умацаваныя ці прыяцелі), сведкі, асобы, якія падаюць дакументы для юрыдычнай фіксацыі і інш.), на падставе чаго робіцца выснова пра непублічны (пры прысутнасці непасрэдных удзельнікаў і іх сведкаў, колькасць якіх не павінна перавышаць шасці чалавек) характар суда. Указваючы на ўдзел час ад часу ў судзе мяшчан, слуг панцырных і путных і інш., гісторык выказвае думку, што судовая інстанцыя, якая ім разглядаецца,

не з’яўлялася строга шляхетнай. «Усе адкланенні земскага суда ў бок ад гэтага тыпа чыста шляхецкага суда здзяйсняюцца пад уплывам жыцця, якое не падпарадкоўваецца рамкам статута ў дадзеным выпадку» [3, с. 285] Адзначаецца і ўдзел жанчын у судовым працэсе. Сярод тэм, якія закрануў І. І. Лапа, было і кола спраў, якія разглядаў і фіксаваў у сваіх запісах земскі суд: ад запісаў каралеўскіх прывілееў, юрыдычнага завярэння здзелак і іншых дакументаў да дэкрэтаў самаго земскага суда і кантроля гродскага. Акрамя вышэй апісанных аспектаў дзейнасці, аўтар апісвае яшчэ і асноўныя пакаранні, якія звычайна прызначаў суд, іх выкананне, прычыны неадпраўлення сесій (войны, маравыя паветрыя, смерць судовага ўрадніка, часы бескаралеўя). Згадваюцца і выпадкі парушэння Статута ці разгляд спраў, якія былі заканадаўча не прадугледжаныя. Асобная частка артыкула была прысвечана генезісу земскага суда, які адводзіцца аўтарам ад судовых структур, што узніклі на Падляшшы ў першай палове XVI ст., праз змены, уведзеныя Бельскім прывілеем у 1564 г., Статутам 1566 г. і далейшае заканадаўчае замацаванне земскага суда паводле Статута 1588 г. Храналагічна агляд земскага суда спыняецца напрыканцы XVI ст. Менавіта гэты артыкул на доўгі час стаў асновай для напісання энцыклапедычных і вучэбных тэкстаў па гісторыі, якія выдаваліся ў Беларусі [6]. Праца была напісана ў часы панавання пазітывіскай метадалогіі, велізарным плюсам якой было – карпатлівая праца з крыніцамі. Лапа ўзняў дастаткова шырокі спектр сацыяльных пытанняў, а таксама штодзённай арганізацыі працы суда, якая ўключала шырокае кола мясцовай шляхты [3].

Дзейнасць судовай сістэмы ВКЛ закраналі ў кантэксце сваіх прац і іншыя даследчыкі перыяду Расійскай імперыі (М. К. Любаўскі, Ф. І. Леантовіч і інш.). Так, М. К. Любаўскі ў сваёй манаграфіі «Литовско-русский сейм», якая пабачыла свет у 1900 г., закрануў пытанне ўтварэння і фарміравання складу земскіх судоў. Аднак дадзеная праца дае хутчэй апісальныя звесткі пра суды, не характарызуючы іх [7]. У 20-я гг. XX ст. у сваёй «Гісторыі Беларусі» М. В. Доўнар-Запольскі прысвяціў маленькі параграф судовай рэформе, якая там апісана таксама дастаткова абмежавана [8].

Такім чынам, у гэты перыяд быў напісаны шэраг прац, якія закраналі земскую судовую сістэму ВКЛ, большасць з якіх разглядалі яе ў рамках больш шырокіх тэм, таму адводзілі ёй няшмат увагі. Толькі адно даследаванне гэтага часу ставіла перад сабой задачу разгледзець непасрэдна земскі суд. Гэтая праца І. І. Лапы і заклала фундамент для далейшага вывучэння і стала асновай для далейшай распрацоўкі тэмы.

З 20-х і да 80-х гг. земская судовая сістэма перастала вывучацца з-за пераводу вектара зацікаўленасці на іншыя праблемы. Земскі суд з’яўляўся саслоўным шляхецкім органам, што выходзіла за межы запатрабаваных даследаванняў і інтарэсаў новага дзяржаўнага ладу Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і іх пануючых ідэалогій.

Аднак у гэты перыяд атрымала развіццё іншая неад’емная частка ў вывучэнні пытання Браслаўскага земскага суда – гэта вывучэнне агуль-

най гісторыі Браслаўскага павета. Асноўнай працай па гісторыі дадзенага рэгіёна з'яўляецца манаграфія польскага гісторыка Отана Гедэмана, якая пабачыла свет у 1930 г. у Вільні. Крыніцы, якімі карыстаўся даследчык для напісання сваёй працы, з большасці ахопліваюць перыяд XVII–XIX ст., але часткова закранаюць і больш ранні час. Гэта дазволіла яму не толькі напісаць агульную гісторыю Браслаўскага павета, але і скласці спісы вядомых яму ўраднікаў павета, у тым ліку і браслаўскага земскага суда, ад пачатку яго заснавання да канца дзейнасці [1].

У канцы XX ст. гісторыкі права ізноў звярнуліся да заканадаўства і права ВКЛ. Аднак разгляд земскай судовай сістэмы напачатку заставаўся дастаткова ўскосным, засноўваючыся на даследаванні І. І. Лапы [6]. Але ў хуткім часе з'явіліся працы беларускіх правазнаўзцаў Таісіі Іванаўны Доўнар і Юліі Пятроўны Гаўрыльчэнка (Доўнар). [9] Працы апошніх разгледзелі судовую рэформу 1560-х гг., падчас якой і былі створаны земскія суды на тэрыторыі ВКЛ. У кантэксце іх даследаванняў была адведзена значная роля утварэнню земскай судовай сістэмы і яе функцыянаванню паводле тагачаснага заканадаўства, а таксама ахарактарызавана яе роля ў агульнай судовай сістэме ВКЛ, аднак у сувязі з галоўнай задачай дадзеныя працы закраналі толькі прававы аспект дзейнасці земскіх судоў.

Паралельна з правазнаўцамі да пытання земскіх судоў звярнуліся і гісторыкі. Асноўнай праблематыкай, якая пачала разглядацца, стала роля судовых земскіх ураднікаў у агульнадзяржаўным прадстаўніцтве і абмежаванні манаршага права на шляхецкіх элекцыйных сойміках у прызначэнні павятовых земскіх судовых ураднікаў праз выбар кандыдатаў на земскія павятовыя пасады суддзі, падсудка і пісара. На значнасць земскіх судовых пасад звярнулі ўвагу і прысвяцілі шэраг артыкулаў такія гісторыкі, як беларусы Віталь Галубовіч і Андрэй Радаман, палякі Анджэй Закжэўскі, Анджэй Рахуба, літовец Дарыус Вілімас [11–19]. Пачаў даследавацца ўдзел гэтых самых земскіх судовых ураднікаў у надзвычайных судах часоў першых бескаралеўяў, што вывучалі вышэй названыя Д. Вілімас і А. Радаман, а таксама польскія гісторыкі Генрык Люлевіч, Дыяна Канечна і беларускі даследчык Зінаіда Васільеўна Антановіч [20–25].

Разам з ростам цікавасці да лакальнай гісторыі і мікрагісторыі быў напісаны шэраг артыкулаў, прысвечаных земскім судам асобных паветаў. Асобныя артыкулы былі прысвечаны браслаўскаму (Г. Люлевіч [26]), упіцкаму (Д. Вілімас – штодзённая практыка і чыноўніцкі састаў, эліта і паўсядзённасць у парэформенны перыяд (1566–1588) [27]), ваўкавыскаму ( А. Залівака [28]), слонімскаму (С. Капыскі – увядзенне судовай рэформы 1565–1566 гг. на тэрыторыі павета [29]), полацкаму (А. Радаман – арганізацыя і склад суда ў другой палове XVI – першай трэці XVII ст. [30; 31], гарадзенскаму (А. Шаланда – 1555–1564 гг. [32], Л. Іванова – у кантэксце статутаў напрыканцы XVI ст. [33]) і ашмянскаму (Д. Вілімас – 1564–1588 гг.[34]) земскім судам. У сааўтарстве А. Радамана, В. Галубовіча і Д. Вілімаса былі напісаны працы па земскіх ураднiках другой

паловы XVI – першай паловы XVII ст. розных частак ВКЛ: Віцебскаму і Полацкаму ваяводствах [35; 36], Гарадзенскаму і Ваўкавыскаму паветах [37].

Браслаўскі земскі суд асобна вывучаў напрыканцы 90-х гг. XX ст. польскі даследчык Генрых Люлевіч, які правёў аналіз васьмі актавых кніг браслаўскага земкага суда, якія ахопліваюць перыяд 1603–1632 гг. У сваім артыкуле гісторык прыводзіць крыніцазнаўчы агляд дадзеных крыніц, якія прадстаўляюць дакументы непасрэднай дзейнасці земскага суда дадзенага павета, што дазваляе яму апісаць не толькі фізічны стан вышэй названых матэрыялаў, мову іх напісання і г. д., але і зрабіць некаторыя высновы пра функцыянаванне суда не толькі як элемента судовай сістэмы павета, але як часткі агульнапавятовага жыцця таго перыяду. Прааналізаваныя матэрыялы польскі навуковец падзяліў на тры асобныя групы: 1) дэкрэты земскага суда; 2) дакументы цякучага функцыянавання дадзенага суда (рэляцыі, інтрамісіі, позвы і г. д.); 3) дакументы іншай шляхты для натарыяльнага завярэння (тэстаменты, акты куплі-продажу, арэндныя лісты, акты маёмаснага падзелу спадчыны і іншыя). Але, як пазначае навуковец, некаторыя запісы ў гэтыя групы не ўпісваюцца (напрыклад, рэгістр збору срэбрашчызны ў 1628 г. і г. д.). Дадзенай класіфікацыяй, улічваючы характар крыніц, Г. Люлевіч закранае кампетэнцыю земскага суда.

Праз аналіз частаты, тэрміну дзеяння сесій Браслаўскага земскага суда ў вызначаны перыяд і гіпотэзу пра асноўныя магчымыя прычыны неправядзення кадэцый (войны і вакацыі ўрада, па прычыне зменаў у асабовым складзе апошняга з-за смерці ці пераназначэння на іншыя пасады судовых ураднікаў) гісторык робіць выснову пра поўную захаванасць дакументацыі за 1603–1632 гг. Паводле яе ў суме з нешматлікасцю матэрыялаў актавых кніг Г. Люлевіч пацвердзіў звесткі пра памеры шляхецкай лакальнай супольнасці ў Браслаўскім павеце. Разгляд біяграм судовых земскіх ураднікаў даў магчымасць казаць пра сфарміраванасць мясцовай эліты праз стабільнасць ураду, уплыў магнатэрыі на браслаўскую шляхту, а таксама, узяўшы пад увагу вопыт земскіх судовых ураднікаў на іншых пасадах, польскі даследчык робіць выснову пра важнае палажэнне ўраднікаў дадзенага суда на сацыяльнай лесвіцы. [26]

А браслаўскіх судовых земскіх ураднікаў у сваім артыкуле, прысвечаным элекцыйным соймікам Браслаўскага павета ў другой палове XVI ст., разглядае А. Радаман [15]. Беларускі гісторык разглядае кар’ерны рост павятовых ураднікаў пасля рэформы 1565 г. і да 1620 г. Падобнае пытанне закранаў і В. Галубовіч [38] у сваім артыкуле па кнігах запісаў метрыкі ВКЛ першай паловы XVII ст. як крыніцы па гісторыі Браслаўшчыны. Паводле прывілеяў на наданне пасад ён выводзіць асноўныя роды Браслаўскага павета, прадстаўнікі якіх займалі большасць асноўных месцаў, і ўказвае на тое, што ў асноўным павятовыя пасад, у тым ліку і судзебных земскіх ураднікаў, з’яўляліся плацдармам для далейшага кар’ернага росту.

Земская судовая сістэма на працягу ўсяго вывучэння даследавалася як гісторыкамі, так і правазнаўцамі. У фокусе ў гісторыкаў права былі

заканадаўчы і прававы бок дзейнасці земскіх судоў, у той час як гісторыкі звярталі ўвагу на паўсядзённую практыку судоў, асобы ўраднікаў, іх месца ў сацыяльнай лесвіцы і г. д. Так, і гісторык І. І. Лапа, і правазнаўца Г. В. Дземчанка разглядалі пакаранні ў ВКЛ, але Дземчанка даследуе заканадаўства, у той час як Лапу больш цікавіць непасрэднае выкананне пакаранняў на прыкладах, якія адбіліся ў актавых крыніцах [3; 5]. Правазнаўца Ю. П. Доўнар і гісторык Л. С. Іванова вывучаюць земскія суды парэформеннага перыяду: першая – утварэнне земскіх судоў у рамках агульнадзяржаўнай судовай рэформы, другая – непасрэднае ўтварэнне Гарадзенскага земскага суда другой паловы XVI ст. і яго дзейнасць на практыцы, хоць і праз прызму статутаў. Такім чынам, даследаванні і гісторыкаў, і правазнаўцаў маюць адзіны аб'ект – земскі суд, але яны адрозніваюцца прадметам вывучэння і крыніцамі, якімі карыстаюцца даследчыкі.

Падсумоўваючы, трэба адзначыць, што ў гістарыяграфіі браслаўскага земскага суда можна вылучыць тры этапы. Першы – XIX – пачатак XX ст.: вывучэнне заканадаўства ВКЛ і земскай судовай сістэмы як агульнадзяржаўнага інстытута судовай улады. У гэты час была напісана праца І. І. Лапы, якая заклала аснову ў даследаванні земскіх судоў. Астатнія вучоныя закраналі судовую земскую сістэму дастаткова павярхоўна. Другі этап, які распачаўся ў 20-я гг. XX ст., стаў лакунай у вывучэнні земскіх судоў, даследаванне якіх з-за саслоўнай шляхецкай прыналежнасці выходзіла з кола інтарэсаў вучоных таго часу. Аднак у гэты перыяд польскім даследчыкам О. Гедэманам было распачата вывучэнне гісторыі Браслаўскага павета, у рамках якога былі сабраныя звесткі пра судовых земскіх ураднікаў дадзеннага павета. Трэці этап – 80-я гг. XX ст. – пачатак XXI ст – распачаўся вяртаннем даследчыцкай цікаўнасці да заканадаўства і права ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Разам з тым былі вызначаны роля і месца земскай судовай сістэмы ў агульнадзяржаўным палітычным развіцці, што прывяло да ўзрастання навуковага інтарэсу да дзейнасці земскіх судоў. З'яўляюцца працы па вывучэнні судоў асобных рэгіёнаў. Не апошняе месца адводзіцца судовым земскім ураднікам. Менавіта на гэтым этапе з'яўляюцца першыя працы, непасрэдна прысвечаныя Браслаўскаму земскаму суду (Г. Люлевіч) і браслаўскім павятовым ураднікам (А. Радаман, і В. Галубовіч). Аднак, нягледзячы на некаторыя крокі ў дадзеным кірунку, гісторыя дзейнасці Браслаўскага земскага суда ў ВКЛ разгледжана дастаткова ўрывачна, што стварае перспектыўнае поле для далейшага больш грунтоўнага яго даследавання айчыннай гістарыяграфіяй.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Hedemann, O.* Historja powiatu Brasławskiego. / O. Hedemann. – Wilno: Polska Druk. Nakłądowa «Lux», 1930. – 484 s.

2. *Лойка, П. А.* Шляхецка-сялянскія міжсаслоўныя адносіны на беларускіх землях у другой палове XVI – першай палове XVII ст. / П. А. Лойка // Российские и славянские исследования: сборник научных статей / Белорусский государственный университет. – Минск, 2009. – Вып. 4. – С. 67–74.

3. *Лаппо, И.* Земский суд в Великом княжестве Литовском в конце XVI века / И. Лаппо // Журнал Министерства Народного Просвещения. Часть CCCXI. – СПб.: Тип. В. С. Балашова, 1897. – № 6. – Отд. 2. – С. 263–301.

4. Предисловие // Акты, издаваемые Комиссией, высочайше учрежденной для разбора древних актов в Вильне: [в 39 т.]. – Вильна: Тип. А. К. Киркора, 1865–1915.

5. *Демченко, Г. В.* Наказание по Литовскому статуту в его трех редакциях (1529, 1566 и 1588 гг.). Исслед. Г. В. Демченка. Ч. 1. – Киев: Тип. Имп. ун-та Св. Владимира, 1894. – [2], V, 273, II с.

6. *Юхо, Я*. Земскі суд. / Я. Юхо // Вялікае княства Літоўскае: ВКЛ: энцыклапедыя: у 2 т. / Беларускі навукова-даследчы інстытут дакументазнаўства і архіўнай справы, Выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі». – Мінск: Беларуская Энцыклапедыя, 2005. – Т. 1. – С. 656; Вішнеўскі, А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі / А. Вішнеўскі. – Мінск: ВП «Экаперспектыва», 2000. – С. 107.

7. *Любавский, М*. Литовско-русский сейм. Опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и внешней жизнью государства / М. Любавский. – Москва, 1900. – 850 с.

8. *Доўнар-Запольскі, М. В*. Гісторыя Беларусі / М. В. Доўнар-Запольскі. – Мінск: БелЭн, 1994. – 510 с.

9. *Довнар, Т.* Судебная реформа в Великом княжестве Литовском и Статут 1566 г. / Г. Довнар // 1566 metų Antrasis Lietuvos Statutas. Respublikinės mokslinės konferencijos, skirtos Antrojo Lietuvos Statuto 425 osioms metinėms pažymėti, medžiaga (Vilnius, 1991 m. Rugsėjo 19–20 d.). – Vilnius, 1993. –P. 56–64.

10. *Доўнар, Ю. П.* Судовая рэформа XVI стагоддзя ў Вялікім Княстве Літоўскім / Ю. П. Доўнар. – Мінск: Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, 2007. – 173 с.

11. Г*алубовіч, В.* Намінацыйныя прывілеі на павятовыя земскія пасады з кніг запісаў Метрыкі Вялікага княства Літоўскага першай паловы 17 ст. як крыніца па гісторыі Беларусі / В. Галубовіч // Гістарычны альманах / рэд. А. Краўцэвіч. – Горадня, 2001. – Т. 5. – С. 135–148.

12. *Радаман, А*. Элекцыйныя лісты як крыніца вывучэння дзейнасці соймікаў Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага другой паловы XVI – пачатку XVII ст. / А. Радаман // Архіварыус: зборнік навуковых паведамленняў і артыкулаў / Дэпартамент па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Мінск: БелНДІДАС, 2004. – Вып. 2. – С. 99–104.

13. *Радаман, А.* Элекцыйныя соймікі Навагародскага павета ў другой палове XVI ст. / А. Радаман // Гісторыя Беларусі: новае ў даследаванні і выкладанні: матэрыялы Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі (Менск, 27 сакавіка 1999 г.): у 2 ч. – Мінск: БДПУ імя М. Танка, 1999. – Ч. 2. – С. 109–115.

14. *Радаман, А.* Шляхецкія соймікі і з’езды як структурная адзінка сістэмы ўлады ў Менскім павеце ў другой палове XVI ст. / А. Радаман // Магдэбургскае права на Беларусі: матэрыялы навуковай канферэнцыі, прысвечанай 500-годдзю выдачы гораду Менску граматы на магдэбургскае права (Менск, 26 сакавіка 1999 г.). – Мінск: Право и экономика, 1999. – С. 79–87.

15. *Радаман, А*. Элекцыйныя соймікі Браслаўскага павета ў другой палове XVI ст. / А. Радаман // Браслаўскія чытанні: матэрыялы V-й навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 935-годдзю першай згадкі Браслава ў пісьмовых крыніцах (Браслаў, 27–28 красавіка 2000 г.) / рэд. рада: К. Шыдлоўскі [і інш.]. – Браслаў, 2001. – С. 75–83.

16. *Zakrzewski, A. B.* Ograniczenie przez sejmiki Wielkiego Księstwa Litewskiego monarszego prawa mianowania urzędników sądowych XVII–XVIII w. / A. B. Zakrzewski // Lietuvos valstybė XII–XVIII a.: mokslinis leidinys: straipsnių rinkinys – Vilnius, 1997. – P. 173–186.

17. *Zakrzewski, A. B.* Sejmik elekcyjny / A. B. Zakrzewski // Sejmiki Wielkiego Księstwa Litewskiego XVI–XVIII w. Ustrój i funkcjonowanie: sejmik trocki / A. B. Zakrzewski. – Warszawa: Liber, 2000. – S. 154–170.

18. *Рахуба, А.* Элекцыі на пасады / А. Рахуба // Вялікае Княства Літоўскае ў парламенцкай сістэме Рэчы Паспалітай (1569–1763 г.) / А. Рахуба. – Мінск: Медысонт, 2008. – С. 222–223.

19. *Вилимас, Д.* Принцип справедливости и судебная власть в историческом процессе (земские суды Великого княжества Литовского конца XVI в. и их роль в разрешении общественных противоречий) / Д. Вилимас // Разнастайнасць моў і культур у кантэксце глабалізацыі: матэрыялы Міжнар. сімпозіума, Менск, 9–10 ліпеня 2002 г.: у 2 кн. / рэдкал.: А. Мальдзіс (гал. рэд.) [і інш.]. – Минск: БелСаЭС «Чарнобыль», 2003. – Кн. 2. – С. 137–142.

20. *Вилимас, Д.* Врядники земских судов Великого княжества Литовского – участники сеймов Речи Посполитой и Главных съездов ВКЛ (1569–1588 г.). / Д. Вилимас // Парламенцкія структуры ўлады ў сістэме дзяржаўнага кіравання Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай у XV–XVIII стагоддзях: матэрыялы Міжнар. навук. канферэнцыі (Менск – Наваградак, 23–24 лістапада 2007 г.) – Мінск: БІП-СПлюс, 2008. – С. 91–95.

21. *Radaman, A.* Samorząd sejmikowy w powiatach województwa nowgródzkiego Wielkiego Księstwa Litewskiego w latach 1565–1632 / A. Radaman // Praktyka życia publicznego w Rzeczypospolitej Obojga Narodów w XVI–XVIII wieku / pod red. U. Augustyniak i A. B. Zakrzewskiego. – Warszawa, 2010. – S. 55–103.

22. *Радаман, А.* Шляхецкія з’езды і соймікі Навагародскага павета і праблема ўзнікнення каптуровых судоў ў Вялікім княстве Літоўскім, Рускім і Жамойцкім ў час бескаралеўяў другой паловы XVI ст. / А. Радаман // Вестник Академии МВД Республики Беларусь. – Мінск, 2004. – № 1 (7). – С. 132–136.

23. *Lulewicz, H.* Funkcjonowanie sądownictwa szlacheckiego w WKsL w okresie pierwszych bezkrólewi (1572–1576) / H. Lulewicz // Z dziejów kultury prawnej. Studia ofiarowane Profesorowi J. Bardachowi w dziewięćdziesięciolecie urodzin. – Warszawa, 2004. – S. 361–367

24. *Konieczna, D.* Wpływ sejmiku brzesko-litewskiego na działalność sądu kapturowego w okresie 1572– 1764 / D. Konieczna // Studia historyczno-prawne. Księga poświęcona pamięci Profesora J. Seredyki. – Opole, 2008. – S. 177–187.

25. *Антановіч, З.* Гарадзенскі каптуровы суд у XVII–XVIII ст. / З. Антановіч // Гарадзенскі палімпсест III. 2010. Дзяржаўныя і сацыяльныя структуры. XVI–XX ст. / Пад рэд. А. Смаленчука, Н. Сліж. – Мінск: Зміцер Колас, 2011. – С. 57–83.

26. *Lulewicz, H.* Sąd ziemski brasławski w świetle zachowanych ksiąg ziemskich z lat 1603–1632 / H. Lulewicz // Miscellanea Historico-Archivistica. – Warszawa, 1998. – T. X. – S. 151–161.

27. *Вилимас, Д.* Элита и повседневность земских судов Упитского повета в 1566–1588 г. (по материалам упитских земских судов) / Д. Вилимас // Соціум. Альманах соціальної історії. – Київ, 2005. – Вип. 5. – С. 41–50.

28. *Залівака, А.* Гісторыя дзяржустаноў ВКЛ: артыкулы / А. Залівака. – Мінск: Энциклопедикс, 2011. – 88 с.

29. *Капыскі, С.* Увядзенне земскіх судоў паводле земскай рэформы 1565–1566 г. (на прыкладзе Слонімскага павета) / С. Капыскі // Леў Сапега (1557–1633 гг.) і яго час: зборнік навуковых артыкулаў / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, УА «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы». – Гродна, 2007. – С. 106–110.

30. *Радаман, А.* Полацкі земскі суд у другой палове XVI – першай трэці XVII ст. / А. Радаман // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы IV Міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 1140-годдзю Полацка (Полацак, 23–24 кастрычніка 2002 г.) / уклад. Т. А. Джумантаева. – Полацк: НПГКМЗ, 2003. – С. 216–227.

31. *Радаман, А.* Арганізацыя і склад полацкага земскага суда ў другой палове XVI – першай трэці XVII ст. / А. Радаман // Герольд Litherland: навуковы геральдычны часопіс. – 2011. – № 18. – С. 21–36.

32. *Шаланда, А.* Земскі суд Гарадзенскага павета ў 1555–1564 гг. / А. Шаланда // Гарадзенскі палімпсест. 2009. Дзяржаўныя ўстановы і палітычнае жыццё, XV–XX ст.: зборнік матэрыялаў II Міжнароднай навуковай канферэнцыі, лістапад 2009 г., г. Гродна / пад рэд. А. Ф. Смаленчука, Н. У. Сліж. – Гродна, 2009. – С. 35–64

33. *Іванова, Л.* Гарадзенскі земскі суд у канцы XVI ст. у кантэксце Статутаў Вялікага Княства Літоўскага 1566 і 1588 гг. / Л. Іванова // Гарадзенскі мiленiум: зборнік артыкулаў / уклад.: Н. Сліж. – Мінск: Гайсак, 2014. – (Arche Пачатак ; № 11 (132)). – С. 106–122.

34. *Вилимас, Д.* Ошмянский земский суд в 1564–1588 гг. / Д. Вилимас // Ашмяншчына: праблемы рэгіянальнай гісторыі Беларусі: зборнік навуковых артыкулаў. – Мінск, 2011. – С. 128–135.

35. *Радаман,* А. Земскія ўраднікі Полацкага ваяводства (другая палова XVI – першая палова XVII ст.) / А. Радаман, Д. Вілімас, В. Галубовіч // Commentarii polocenses historici= Полацкія гістарычныя запіскі: навуковы часопіс. – Наваполацк: Tomus Primus, 2004. – Том I. – С. 73–80.

36. *Радаман, А.* Земскія ураднікі Віцебскага ваяводства ў другой палове XVI – першай палове XVII стст. / А. Радаман, Д. Вілімас, В. Галубовіч // Commentarii polocenses historici = Полацкія гістарычныя запіскі: навуковы часопіс. – Наваполацк: Tomus Primus, 2005. – Т. II. – С. 51–61.

37. *Радаман, А.* Земскія ураднікі Гарадзенскага павета ВКЛ (другая палова XVI – першая палова XVII ст.) / А. Радаман, Д. Вілімас, В. Галубовіч // Павятовая шляхта ВКЛ: гісторыя, геральдыка, генеалогія, культура (XVI—XVIII ст.): матэрыялы навуковай канферэнцыі, Горадня, 18 лютага 2005 г. / рэд. А. Шаланда. – (Герольд Litherland; № 17). – Горадня, 2006. – С. 98–109.

38. *Галубовіч, В.* Кнігі запісаў метрыкі Вялікага Княства Літоўскага першай паловы XVII стагоддзя як крыніца па гісторыі Браслаўшчыны / В. Галубовіч // Браслаўскія чытанні: матэрыялы V навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 935-годдзю першай згадкі Браслава ў пісьмовых крыніцах (Браслаў, 27–28 красавіка 2000 г.). – Браслаў, 2001. – С. 22–25.

**(Дата падачы: 27.02.2018 г.)**

*П. Ю. Булаты*
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Мінск

*P. Bulaty*
Republican Institute of Higher Education, Minsk

**УДК 94(4)**

# УЗНІКНЕННЕ І ЭТАПЫ ЭВАЛЮЦЫІ ТЭРМІНАЎ «ГРАФ» І «ГРАФСТВА» Ў ЗАХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ

# ORIGIN AND STAGES OF EVOLUTION OF THE TERM «COUNT» AND «COUNTIES» IN WESTERN EUROPE

*Артыкул прысвечаны тэме ўзнікнення тытула «граф» у Заходняй Еўропе. Паказаны працэс трансфармацыі паняццяў «граф» і «графства» ў еўрапейскай прасторы. У дадзеным працэсе можна вылучыць тры этапы: бюракратычны, феадальны, тытулярны. Кожны з іх мае свае адметнасці ў разуменні сэнсу арыстакратычнага тытула.*

*Ключавыя словы: тытул; граф; графства.*